**Білет 16**

**Практычнае заданне.**

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя бai ў Беларусі і іх значэнне.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Як называўся план нападу фашысцкай Германіі на СССР?
2. Дзе летам 1941 года Чырвоная Армія нанесла танкавы контрудар па германскіх войсках? Пакажыце гэта месца на картасхеме.
3. Якое стратэгічнае значэнне мелі абарончыя баі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.?
4. У заходняй літаратуры асноўнымі прычынамі краху гітлераўскага плана «маланкавай вайны» называюць неспрыяльныя кліматычныя ўмовы і вялізныя тэрыторыі СССР. Ці згодны вы з гэтым сцвярджэннем? Якія прычыны правалу гітлераўскага плана «маланкавай вайны» вы б назвалі?

**I. З Дырэктывы № 21 Вярхоўнага камандавання ўзброенымі сіламі Германіі (план «Барбароса»).** *18 снежня 1940 г.*

«Германскія ўзброеныя сілы павінны быць гатовы разбіць Савецкую Расію падчас кароткачасовай кампаніі <…>.

Асноўныя сілы рускіх сухапутных войскаў, якія знаходзяцца ў Заходняй Расіі, павінны быць знішчаны ў смелых аперацыях з дапамогай глыбокага, хуткага вылучэння танкавых клінаў. Адступленне баяздольных войскаў праціўніка на шырокія прасторы рускай тэрыторыі павінна быць прадухілена.

… Кірунак галоўнага ўдару павінен быць на поўнач ад Прыпяцкіх балот. Тут трэба засяродзіць дзве групы армій. ...На поўначы – хутка выйсці да Масквы. Захоп гэтага горада азначае вырашальны поспех…».

**II. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»)*

... Каб стрымаць наступленне праціўніка на лініі рэк Заходняя Дзвіна і Днепр, Стаўка прыняла меры па ўмацаванні Заходняга фронту рэзервамі. 6 ліпеня 1941 г. паміж Віцебскам і Оршай адбылася адна з самых буйных танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З дзвюх бакоў удзельнічала каля 1600 танкаў. За тры дні баёў савецкія механізаваныя карпусы прасунуліся да 40 км. Значныя страты былі нанесены ворагу, зніжана яго ўдарная сіла, замаруджаны тэмп прасоўвання на ўсход. Тым не менш 11 ліпеня 1941 г. немцы захапілі Віцебск.

З 3 па 26 ліпеня 1941 г. ішлі напружаныя баі ў раёне Магілёва, якія стойка абаранялі войскі Заходняга фронту і байцы атрадаў народнага апалчэння. Непасрэдную абарону горада вяла 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М. Т. Раманава. Два тыдні яна трымала абарону каля вёскі Буйнічы. Найбольш жорсткія баі адбываліся 12 ліпеня, у гэты дзень савецкія воіны знішчылі 39 танкаў і адбілі некалькі нападаў праціўніка.

Больш за месяц ішлі баі за Гомель. Горад абаранялі не толькі войскі Цэнтральнага фронту, але і 6700 апалчэнцаў, і каля 3 тыс байцоў знішчальных батальёнаў.

Нягледзячы на ўпартае супраціўленне войскаў Заходняга фронту, да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была захоплена ворагам.

Аднак адчувальныя страты панёс і праціўнік: да 10 ліпеня было знішчана 79058 салдат і афіцэраў, 1061 гармата і мінамёт, 826 самалётаў і 350 танкаў. Групоўка армій «Цэнтр» з канца лета 1941 г. вымушана была прыпыніць наступленне. Гітлераўскі план «Барбароса» стаў даваць збоі. «Маланкавай вайны» не атрымалася.

## III. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня – жнівень 1941 г.

